**23 ліпеня 2024 г. – 80 гадоў з дня нараджэння (1944) Георгія Рыгоравіча Гулюка, дзяржаўнага дзеяча, доктара сельскагаспадарчых навук, заслужанага меліяратара РСФСР**



Георгій Рыгоравіч Гулюк нарадзіўся 23 ліпеня 1944 года ў в. у Дварэц (Яромічы) Кобрынскага раёна ў сялянскай сям'і. Бацька, Рыгор Паўлавіч Гулюк, равеснік Кастрычніцкай рэвалюцыі, якому давялося прайсці Другую сусветную вайну, у 1939 годзе ваяваць супраць немцаў у польскай арміі, у 1944-м з групай партызан далучыцца да войск Чырвонай арміі. Старшы сяржант Рыгор Гулюк дайшоў да Берліна і там сустрэў Перамогу. Разам з жонкай Соф'яй Мяфодзьеўнай выгадавалі дачку Галіну і сына Георгія.

Вучыўся Георгій Гулюк у Мінянскай сярэдняй школе Кобрынскага раёна, якую скончыў у 1962 г., тады ж у роднай школе пачаў працоўную дзейнасць лабарантам. Пасля службы ў Савецкай арміі (1963-1966) пайшоў працаваць у Яроміцкае БМУ трэста «Брэстводбуд». З 1966 года па 1973 год - рабочы, брыгадзір, прараб Яроміцкай МТС. З 1973 года па 1977 год - галоўны інжынер, начальнік ПМК у г. Маларыце Брэсцкай вобласці. У 1979 годзе скончыў Беларускую сельскагаспадарчую акадэмію па спецыяльнасці «Гідрамеліярацыя».

У 1977 годзе Георгій Гулюк накіраваны на працу ў Валагодскую вобласць. Працаваў галоўным інжынерам, начальнікам аб'яднання «Волагдамеліярацыя», затым намеснікам старшыні аб'яднання «Волагдааграбуд». Выбіраўся членам Валагодскага абкама КПСС і аблвыканкама.

У 1988 годзе пераведзены на працу ў Маскву. З 1988 года па 1999 год Георгій Рыгоравіч працаваў намеснікам начальніка Галоўначарназеммеліявадгаса пры Дзяржаграпраме Нечарназёмнай зоны РСФСР, намеснікам старшыні Дзяржаграпрама Нечарназёмнай зоны РСФСР, прэзідэнтам акцыянернай аграбудаўніча-прамысловай карпарацыі «Цэнтрынжсельбуд».

У 1999-2001 гадах Г. Р. Гулюк - кіраўнік Дэпартамента меліярацыі зямель і сельскагаспадарчага водазабеспячэння Міністэрства сельскай гаспадаркі і харчавання Расійскай Федэрацыі (РФ), затым Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ; з 2001 года 2004 год - кіраўнік Дэпартамента меліярацыі зямель і сельскагаспадарчага водазабеспячэння. У 2004-2005 гадах Г. Р. Гулюк - начальнік Упраўлення меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Федэральнага агенцтва па сельскай гаспадарцы. З 2005 года па 2008 год - дырэктар Дэпартамента меліярацыі і тэхнічнага забеспячэння Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ. Віцэ-прэзідэнт Міжнароднай камісіі па ірагацыі і дрэнажу, член калегіі Міністэрства сельскай гаспадаркі РФ. Галоўны рэдактар часопіса «Мелиорация и водное хозяйство».

Георгій Рыгоравіч Гулюк з’яўляецца дзяржаўным саветнікам Расійскай Федэрацыі II класа (класны чын прысвоены Указам Прэзідэнта Расійскай Федэрацыі ад 11 сакавіка 2008 года). Заслужаны меліяратар РСФСР Георгій Гулюк Больш за 50 гадоў працаваў у у галіне меліярацыі. Заслужаны меліяратар Расійскай Федэрацыі. Узнагароджаны ордэнам Пашаны, медалём «За преобразование Нечерноземья РСФСР» і 8 іншымі медалямі.

*Матэрыял падрыхтаваны ў 2019 г., дапоўнены ў 2024 г.*
*Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкай.*
*Курачук Святлана Дзмітрыеўна, бібліёграф*
*аддзела абслугоўвання і інфармацыі*

### Працы Г. Р. Гулюка

**Гулюк, Георгий Григорьевич**. Гидрологические свойства и продуктивность дерново-подзолистых оглеенных почв при различных режимах и продолжительности работы гончарного дренажа : дис. кандидат сельскохозяйственных наук: 06.01.03 - Агропочвоведение и агрофизика / Г. Г. Гулюк. – Москва, 2000. - 182 с.

**Гулюк Георгий Григорьевич**. Почвенно-экологические факторы длительного использования мелиорированных земель Нечерноземной зоны: автореферат диссертации на соискание ученой степени доктора сельскохозяйственных наук: 06.01.03 / Гулюк Георгий Григорьевич. - Санкт-Петербург, 2005. - 41 с.

**Гулюк, Г. Г.** Агромелиоративные мероприятия при длительной эксплуатации дренажа и экологической реабилитации техногенно загрязненных земель гумидной зоны

/ Георгий Григорьевич Гулюк. - М. : Изд-во Московского ун-та, 2004. - 232 с.

**Гулюк, Г. Г.** Земля отблагодарит / Георгий Гулюк. - Москва : Росинформагротех, 2007. - 287 с., [18] л. ил., портр., цв. ил., портр.

**Гулюк, Г. Г.** Эффективное функционирование дренажных систем на минеральных землях Нечерноземной зоны России / Г. Г. Гулюк, А. В. Шуравилин ; [М-во сел. хоз-ва Рос. Федерации]. - Москва : Росинформагротех, 2007. - 376 с. : ил., табл.

**Руководство** по мелиорации полей / Г. Г. Гулюк, Ю. Г. Янко, В. И. Штыков [и др.] ; Федеральное государственное бюджетное научное учреждение Агрофизический научно-исследовательский институт. - Санкт-Петербург : ФГБНУ АФИ, 2020. - 217 с.

**Ремонт** закрытого трубчатого дренажа участка мелиорации сельскохозяйственного поля в Псковской области / Гулюк Г. Г. [и др.] // Мелиорация и водное хозяйство (Москва). – 2021. - № 1. – С. 15-18.

**Байбеков, Р. Ф.** Перспективы химическкой мелиорации кислых почв / Р. Ф. Байбеков, Г. Г. Гулюк, Н. И. Аканова // Мелиорация и водное хозяйство (Москва). – 2020. - № 6. – С. 19-24.

**Гулюк, Г. Г.** День российского поля – школа передового опыта / Г. Г. Гулюк // Мелиорация и водное хозяйство (Москва). – 2020. - № 4. – С. 2-5. – (Страница редактора).

**К вопросу** разработки нового экспресс-метода определения объема и массы почвы, смытой в результате водной эрозии / Г. Г. Гулюк, Г. Т. Балакай, А. Н. Бабичев, В. Иг. Ольгаренко, В. А. Монастырский. Д. А. Шевченко // Научный журнал Российского НИИ проблем мелиорации [Электронный ресурс]. – 2018. – № 4(32). – С. 20–37.

**Технологические** схемы удаления древесно-кустарниковой растительности при проведении культуртехнических работ / С. М. Васильев, Г. Г. Гулюк, Ю. Е. Домашенко, Л. А. Митяева, М. А. Ляшков // Научный журнал Российского НИИ проблем мелиорации [Электронный ресурс]. – 2018. – № 4(32). – С. 126–145.

**Гулюк, Г. Г.** Освоение долголетней залежи при возделывании сеяных злаковых трав / Г. Г. Гулюк, Н. А. Семёнов, А. В. Шуравилин, Н. В. Сурикова // Мелиорация и водное хозяйство (Москва). – 2017. - № 4. - С. 19-23.

**Гулюк, Г. Г.** Сохранение и восстановление плодородия почв – залог продовольственной безопасности страны / Г. Г. Гулюк // Природообустройство. – 2015. - № 5. – С. 9-13. – (Международный научный форум).

## Аб жыцці і дзейнасці Г. Р. Гулюка

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Памяць. Кобрынскі раён : гісторыка-дакументальная хроніка. – Мінск, 2002. - С. 432. – (Імі ганарацца землякі).

**Лукашик, П. И**. Прошлое и настоящее / Петр Иосифович Лукашик. – Брест : Брестская типография, 2002. – 48 с.

Гулюк Г. Г. – см. на с. 33.

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Людзі навукі нашага краю : біябібліяграфічны даведнік / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. гал. бібліёграф С. Д. Курачук ; дызайн вокладкі: інжынер П. С. Грыневіч. - 2-е выд., дапрац. і дап. – Кобрын, 2020. – С. 29-30 : фат. – (Серыя «Імёны на карце Кобрыншчыны»).

**Гулюк Георгій Рыгоравіч** // Па працы - пашана : біябібліяграфічны даведнік з серыі «Імёны на карце Кобрыншчыны» / Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма, цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад. : С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. – Кобрын, 2020. – С. 147. : фат.

**80 гадоў** з дня нараджэння Г. Р. Гулюка (1944) // Зводны Каляндар дат і падзей Кобрыншчыны : краязнаўча-бібліяграфічны каляндар на 2021–2025 гг. / Дзяржаўная ўстанова культуры «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма», цэнтральная раённая бібліятэка, аддзел абслугоўвання і інфармацыі ; склад.: С. Д. Курачук, Л. С. Дардзюк. - Кобрын, 2020. - С. 120.

**Курачук, С.** Кобринское слово сказано и в науке / Светлана Курачук // Кобрин-информ. - 2017. - 20 июля (№ 29). - С. 5.

Кобринская центральная районная библиотека начинает работу над очередным проектом «Славутыя імёны Кобрыншчыны».

**Наш** земляк в российском министерстве // Заря. – 2008. – 24 мая. – С. 2.

Директор Департамента мелиорации Минсельхозпрода России Георгий Гулюк – уроженец д. Еремичи.

**Мельнік, Р.** Адметная дата ў календары / Раман Мельнік // Кобрынскі веснік. - 2008. - 5 лістапада. - С. 1.

Сын Р. П. Гулюка Георгій - доктар сельскагаспадарчых навук.

Кобрынскі раён
Яромічы
Гулюк Георгій Рыгоравіч
Меліяратары
Вучоныя